http://pismennik.by/%D0%B4%D0%B7%D0%B5%D0%BB%D1%8F-%D0%BF%D0%B0%D0%BC%D1%8F%D1%86%D1%96-%D1%96-%D1%80%D0%B0%D0%B7%D0%B2%D1%96%D1%86%D1%86%D1%8F-%D1%82%D0%B2%D0%BE%D1%80%D1%87%D1%8B%D1%85-%D0%BA%D0%B0%D0%BD%D1%82%D0%B0/

ГОМЕЛЬСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ ГА "САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ"

ДЗЕЛЯ ПАМЯЦІ І РАЗВІЦЦЯ ТВОРЧЫХ КАНТАКТАЎ




Па просьбе літаратараў і дзеячаў культуры Кабардзіна-Балкарыі заслужаны дзеяч культуры Беларусі, сакратар Міжнароднага саюза пісьменнікаў і майстроў мастацтва па Беларусі, кіраўнік міжнароднага праекта "Берагі дружбы" па Рэспубліцы Беларусь, празаік і публіцыст Уладзімір Гаўрыловіч ажыццявіў творчую паездку ў старажытны Бабруйск.



Пісьменнік, наведаўшы Бабруйскую крэпасць, аддаў даніну павагі закатаваным ваеннапалонным трох лагераў смерці, што стварылі фашысты ў 1941-44 гадах у самым сэрцы горада. У лістападзе 1941 года, у адным з самых буйных перасыльных лагераў для ваеннапалонных на тэрыторыі Беларусі №131 перастала біцца сэрца першага прафесійнага паэта кабардзінаскай літаратуры, 41-гадовага Алі Шагенцукава. Творца, якім яшчэ пры жыцці ганарыцца ўся Кабарда, памёр ад голаду і здзекаў, але не скарыўся перад фашысцкімі вылюдкамі, адмовіўся служыць ворагу.






Памяць аб творцы па-ранейшаму захоўваецца беларусамі – Уладзімір Гаўрыловіч у гэтым пераканаўся як у мясцовым краязнаўчым музеі (нядаўна тут распрацавалі спецыяльную экскурсію з наведваннем прыкладнага месца захавання кабардзінскага паэта), так і ў бібліятэцы-філіяле №7 імя А.С. Шагенцукава (тут праводзяцца ўрокі памяці, паэтычныя чытанні і многае іншае ў гонар вялікага сына Каўказа). Пра той страшны час літаратару нямала распавяла і мясцовы краязнаўца Святлана Калюта (22 гады таму яна наведвала малую радзіму А.Шагенцукава і дагэтуль падтрымлівае сувязь з асобнымі членамі яго сям'і).


ВСЕМ НЕ ВЕРНУВШИМСЯ С ВОЙНЫ
1941 - 1945
МИЛЛИОНЫ ЖИЗНЕЙ В СМЕРТЬ УШЕДШИХ,
ДРОЖАЩИЙ СВЕТ ЗАПЛАКАННЫХ СМЕРЕЙ,
ВЕКА ПРОЙДУТ, НО В КАЖДЫЙ ДЕНЬ ГРЯДУЩИЙ
НЕ СТИХНЕТ ЭХА БОЛИ В СЕРДЦАХ ЛЮДЕЙ.


ЗА ГОДЫ ОККУПАЦИИ
В БОБРУЙСКИХ
КОНЦЛАГЕРЯХ УНИЧТОЖЕНО 11000 ВОЕННО
УГНАНО В 15000 ЧЕЛОВЕК
РАБСТВО
РАЗРУШЕНО 10 ШКОЛ, 10 КЛУБОВ,
ПЕДУЧИЛИЩЕ, МЕДТЕХНИКУМ,
85 ПРЕДПРИЯТИЙ И МАСТЕРСКИХ.


МИЛЫЙ ОБРАЗ
МАМЫ



Праводзячы сустрэчу з работнікамі бібліятэкі і краязнаўцамі, пісьменнік адзначыў, што сёлетнім летам, знаходзячыся ў Няклінаўскім раёне Растоўскай вобласці, падчас правядзення 7 Міжнароднага фестывалю паэзіі і перакладаў “Берагі дружбы”, ён пазнаёміўся з кабардзінскімі калегамі, сярод якіх былі і прадстаўнікі роду Шагенцукавых. Менавіта яны папрасілі кіраўніка міжнароднага праекта Беларусі пакланіцца куточку сваёй роднай зямлі, якая навечна прыняла іх выдатнага сына, класіка кабардзінскай літаратуры Алі

Асхадавіча Шагенцукава, перадаць шчырыя словы ўдзячнасці як мясцовым краязнаўцам, так і работнікам гарадской бібліятэчнай сістэмы за захаваннне памяці аб ім і дзеля таго, каб творчыя кантакты працягваліся. Сваё абяцанне, дадзенае калегам з Нальчыка, Уладзімір Гаўрыловіч выканаў.

Гэтаксама вядомы беларускі пісьменнік распавёў аб творчых кантактах і праектах перакладаў у межах Міжнароднага саюза пісьменнікаў Беларусі, фестываляў "Берагі дружбы" і "Славянскія літаратурныя дажынкі", адказаў на пытанні ўдзячных бабруйчан. На памяць аб цікавай сустрэчы У.Гаўрыловіч падараваў бібліятэцы-філіялу №7 і краязнаўчаму музею свае творы і выданні, сувеніры, якія хораша распавядаюць пра сталіцу XXIX Дня беларускага пісьменства ў Добрушы, у якім, дарэчы, прымалі ўдзел і краснадарскія і растоўскія літаратары – партнёры Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, якое творца ўзначальвае апошнія 18 гадоў.

Улад ПРЫАЗЁРНЫ

Фота аўтара.